ISSN 2524-2369 (Print)
ISSN 2524-2369 (Print)
ISSN 2524-2377 (Online)
УДК 930.1(476)«1921/39»
https://doi.org/10.29235/2524-2369-2020-65-1-44-51

Поступила в редакцию 04.12.2018
Received 04.12.2018

**А. А. Савіч**

*Брэсцкі дзяржаўны ўніверсітэт імя А. С. Пушкіна, Брэст, Беларусь*

# ГІСТОРЫЯ ЗАХОДНЯЙ БЕЛАРУСІ (1921–1939 гг.) У АЙЧЫННАЙ ГІСТАРЫЯГРАФІІ 50–80-х гг. XX ст.

**Аннотация.** Исследуется процесс развития в 50–80-х гг. XX в. отечественной советской историографии социально-культурной истории Западной Беларуси (1921–1939 гг.), выявлены ее тематические и идейно-политические приоритеты. На основании широкого круга разнообразных источников обоснованно сделан вывод о зависимости отечественной историографии социально-культурной истории Западной Беларуси (1921–1939 гг.) от партийно-государственной идеологии и приоритета революционной тематики. Изучение социокультурной тематики было обусловлено авангардной ролью Компартии Западной Беларуси в общественно-политической ситуации в крае, однозначно отрицательным подавалось польское социокультурное влияние на Западную Беларусь как насильственное навязывание чужих культурно-исторических ценностей, наблюдалось игнорирование социально-культурной жизни представителей других национальных меньшинств и неподконтрольных компартии группировок. В советский период системной предметной разработки темы не существовало, за исключением проблематики коммунистической и демократической печати и состояния народного образования, что объяснялось второстепенным положением этих вопросов в системе марксистско-ленинской методологии. Социально-культурная проблематика развивалась согласно марксистско-ленинским социально-классовым канонам, направленным на нивелирование национальных черт и воспитание интернационалистских приоритетов, следствием чего явились обеднение социокультурной истории Западной Беларуси и отказ от значительных достижений белорусского народа в материальной и духовной культуре, области образования, науки, литературы и искусства.

**Ключевые слова:** историография, Западная Беларусь, политика Польши, культура, язык, образование, публицистика, интеллигенция, социально-культурная история

**Для цитирования:** Савіч, А. А. Гісторыя Заходняй Беларусі (1921–1939 гг.) у айчыннай гістарыяграфіі 50–80-х гг. XX ст. / А. А. Савіч // Вес. Нац. акад. навук Беларусі. Сер. гуманіт. навук. – 2020. – Т. 65, № 1. – С. 44–51. https://doi.org/10.29235/2524-2369-2020-65-1-44-51

**Aliaksandr A. Savich**

*Brest State University named after A. S. Pushkin, Brest, Belarus*

## HISTORY OF WESTERN BELARUS IN 1921–1939 IN DOMESTIC SOVIET HISTORIOGRAPHY OF THE 1950s–1980s

**Abstract.** The study is aimed at understanding the process of formation and development of the Soviet national historiography in 1950s–1980s of the socio-cultural history of Western Belarus in 1921–1939, identifying its thematic, ideological and political orientation. Based on a wide range of sources, a conclusion was made about the conditionality of domestic journalism and scientific historical thought on the socio-cultural issues of Western Belarus in 1921–1939. the assimilation policy of Poland and the desire of the Belarusian people for social liberation and national consolidation. With the exception of the problems of the communist and democratic press and the state of public education, there was no systematic substantive development of the topic during the Soviet period, which was explained by the secondary importance of cultural themes in the system of Marxist-Leninist methodology. The events of social and cultural life were used to confirm the difficult situation of the Belarusian people and as an illustration of the revolutionary struggle for "social and national liberation", the approaches to its study were determined by the place and role of the Communist Party in the social and political situation, the Polish was clearly negative and alien to Belarusians. sociocultural influence on Western Belarus, ignoring the socio-cultural life of members of other national minorities and under control Communist Party groups. Socio-cultural issues developed in accordance with the Marxist-Leninist social-class canons, aimed at leveling national features and fostering internationalist priorities, resulting in the impoverishment of the sociocultural history of Western Belarus, the rejection of significant achievements of the Belarusian people in material and spiritual culture, in the field of education and science literature and art.

**Keywords:** historiography, Western Belarus, policy of Poland, culture, language, education, journalism, intelligentsia, social and cultural history

**For citation:** Savich A. A. History of Western Belarus in 1921–1939 in domestic soviet historiography of the 1950s–1980s. *Vestsi Natsyyanal'nai akademii navuk Belarusi. Seryia humanitarnykh navuk = Proceedings of the National Academy of Sciences of Belarus. Humanitarian Series*, 2020, vol. 65, no. 1, pp. 44–51 (in Belarusian). https://doi.org/10.29235/2524-2369-2020-65-1-44-51

© Савіч А. А., 2020

Складанае становішча культуры Заходняй Беларусі ў 1921–1939 гг. у складзе Польшчы ў айчыннай гістарычнай навуцы традыцыйна з пачатку 1920-х гг. выкарыстоўвалася ў якасці ілюстрацыі акупацыйна-асіміляцыйнай палітыкі Польшчы. Пры гэтым падача матэрыялу часта характарызавалася тэндэнцыйнасцю і заідэалагізаванасцю, высокай эмацыянальнасцю і суб'ектыўнасцю, таму існуе неабходнасць прадметнага гістарыяграфічнага вывучэння заходнебеларускай сацыяльна-культурнай гісторыі. У айчыннай гістарычнай навуцы напрацаваны пэўны вопыт гістарыяграфічнага аналізу дадзенай праблематыкі ў выглядзе гістарыяграфічных аглядаў дысертацыйных даследаванняў і публікацый А. Гужалоўскага [1], А. Вабішчэвіча [2; 3] і А. Загідуліна [4–6], якія канцэнтруюць асноўную ўвагу на сучасным этапе айчыннай гістарыяграфіі, характарызуючы савецкі перыяд галоўным чынам у бібліяграфічным плане. Мэтай дадзенага артыкула з'яўляецца выяўленне ідэйна-палітычных і тэматычных прыярытэтаў айчыннай савецкай гістарыяграфіі сацыяльна-культурнай гісторыі Заходняй Беларусі (1921–1939 гг.) у другой палове 1950-х – 1980-я гг.

Трансфармацыі грамадска-палітычнага жыцця і арганізацыйна-метадалагічныя зрухі ў асвятленні гісторыі Заходняй Беларусі ў першыя гады пасля XX з'езда КПСС першапачаткова істотным чынам не змянілі падыходы і маштабнасць вывучэння гісторыка-культурнай праблематыкі. Яскравым прыкладам з'яўляецца другі том гісторыі БССР. Аўтар аднаго з раздзелаў – Ц. Гарбуноў, таму папярэдняя версія, адлюстраваная ў яго манаграфіі [7, с. 109–112], тут фактычна засталася без змен і нават у фактаграфічным плане збяднела [8, с. 334–335]. Занядбанасць тэматыкі, як і раней, вызначалася яе другараднасцю ў марксісцка-ленінскім вучэнні, традыцыйнай барацьбой з нацыяналістычнымі ўхіламі, а ў адносінах да Заходняй Беларусі – асцярожнасцю ў дачыненні да ўдзельнікаў грамадска-культурных працэсаў. Усе яны, нават сябры КПЗБ і КСМЗБ, за гады палітычнай дыскрэдытацыі КПЗБ і заходнебеларускай праблематыкі, успрымаліся як нядобранадзейныя. Таму вельмі важнай была далейшая рэабілітацыя КПЗБ, з якой супрацоўнічалі большасць дзеячаў культуры, што давала магчымасць айчынным даследчыкам займацца вывучэннем іх творчасці як часткі культурнай спадчыны Заходняй Беларусі.

Сітуацыя «адлігі» садзейнічала запатрабаванаму часам звароту да біяграфій беларускіх грамадска-культурных дзеячаў. Найперш гэта тычылася асобы Б. Тарашкевіча, які застаўся ў памяці жыхароў Заходняй Беларусі як сімвал барацьбы за беларускую культуру і актыўны творца – вучоны, публіцыст, мовазнавец, літаратуразнавец і перакладчык, лёсам якога цікавіліся ў розных колах беларускага грамадства. Напрыклад, В. У. Ражко ў лісце 4 сакавіка 1959 г. у Інстытут гісторыі партыі пры ЦК КПБ заклікаў надалей разгортваць рух па рэабілітацыі КПЗБ, што «дало б магчымасць узняць дух, настрой усіх былых членаў КПЗБ, у сувязі з роспускам КПЗБ у 1938 г. па матывах варожай правакацыі. Пры тым трэба было б лепш асвяціць у друку аб лёсе кіраўніка "Беларускай Сялянска-Рабочай Грамады" – Браніслава Тарашкевіча і іншых яго таварышаў. Мне давялося бываць на радзіме Б. Тарашкевіча і размаўляць з яго братам. Родныя, знаёмыя былыя грамадоўцы і капэзэбоўцы – цікавяцца яго лёсам, чаму да гэтага часу аб гэтым гісторыя маўчыць» [9, арк. 2–3].

У сувязі з гэтым адзначым публікацыі М. Арэхвы, які пасля доўгіх гадоў упершыню на старонках партыйнага друку станоўча выказаўся пра Б. Тарашкевіча, Максіма Танка, П. Пестрака, В. Таўлая, М. Васілька, якія «выраслі і былі выхаваны» пад уплывам КПЗБ і ўсю сваю палітычную дзейнасць і творчасць звязалі з партыяй. І наадварот, М. Арэхва, паводле сваіх палітычных меркаванняў былога апанента, рэзка негатыўна крытыкуе палітычную, а значыць, і сацыякультурную дзейнасць А. Луцкевіча, Р. Астроўскага, А. Станкевіча, якія сваімі канкрэтнымі справамі па арганізацыі беларускага нацыянальна-культурнага жыцця ажыццявілі шмат праектаў антыпольскага, антыакупацыйнага, нацыянальнага беларускага характару, на пэўных этапах сваёй дзейнасці з рознай ступенню актыўнасці і шчырасці супрацоўнічалі з камуністамі, атрымлівалі ад іх падтрымку, аднак па асноўных сваіх ідэйна-палітычных пазіцыях засталіся апанентамі КПЗБ, а значыць, ворагамі [10, с. 32–34].

Што тычыцца асобы Б. Тарашкевіча, то неабходна адзначыць, што яго грамадская і культурна-асветніцкая праца атрымала сваё значнае выяўленне. Разам з тым існавала своеасаблівае спаборніцтва паміж біёграфамі Б. Тарашкевіча, бо вядомая як галоўны спецыяліст па гэтай тэме польская даследчыца А. Бергман, якая пазіцыянавала беларускі сацыяльна-культурны рух

і беларускіх дзеячаў, у першую чаргу Б. Тарашкевіча і А. Луцкевіча як частку агульнапольскай сацыяльна-культурнай плыні, апублікавала свае працы ў 1968 і 1977 гг. [11; 12], у той час як айчынныя беларускія аўтары гісторык Б. Клейн і літаратуразнавец А. Ліс выдалі свае творы адпаведна ў 1963 і 1966 гг. [13; 14].

У цэлым, нягледзячы на традыцыйную павярхоўнасць і фрагментарнасць сацыякультурнай праблематыкі, яна прысутнічала ў гістарычных даследаваннях у якасці абавязковага атрыбута для стварэння завершанай карціны «нацыянальнага заняволення» і барацьбы «за сацыяльнае і нацыянальнае вызваленне», што садзейнічала некатораму яе ўдасканаленню. У першую чаргу гэта тычылася адыходу ад апрыёрнасці і публіцыстычнасці, да якіх схіляліся даследчыкі папярэдняга перыяду. Асвятленне сацыяльна-культурнай сферы хоць і адбывалася па кальцы «нацыянальнага прыгнёту і рэвалюцыйнай барацьбы», але забяспечвалася трывалай крыніцавай базай, у тым ліку ў выглядзе польскай афіцыйнай статыстыкі, а не так, як гэта было раней, – з дапамогай эмацыянальных разважанняў камуністычных публіцыстаў. У першую чаргу гэта тычыцца У. Палуяна і І. Палуяна, якія з асаблівай увагай ставіліся да адукацыйнай тэматыкі і выкрыцця «рэакцыйнай палітыкі» ў школьнай адукацыі, аб’ектывізуючы вядомыя тэзісы пра непрызнанне беларускай нацыі і мовы, закрытыя 400 беларускіх школ, якія «за кароткі час 1918–1919 гг. узніклі ў Заходняй Беларусі», скасаванне беларускіх гімназій і цяжкасці артымання сярэдняй адукацыі; нежаданне польскіх улад даваць нават польскую адукацыю; нездавальняючы матэрыяльны стан школ, згадваючы польскія саступкі на карысць беларускага школьніцтва паводле законаў С. Грабскага; звесткі пра адкрыццё ў 1927–1928 гг. пад ціскам беларускага народа 78 беларускіх і змешаных школ з іх наступным закрыццём. Да гэтага аўтары дадалі агульныя звесткі пра цяжкія палітычныя ўмовы для функцыянавання «аб’ектыўных і дэмакратычных» газет [15, с. 36–37, 16, с. 31–35].

Другі аспект бачнага развіцця праблематыкі звязаны з паглыбленнем асвятлення культурнаасветніцкай дзейнасці масавых нацыянальна-вызваленчых арганізацый ТБШ, БСРГ і «Змаганне». На падставе палітыка-ідэалагічнага ўздзеяння савецкіх партыйна-дзяржаўных інстанцый, якія працягвалі мысліць катэгорыямі канфрантацыі, гісторыка-сацыякультурная сфера Заходняй Беларусі неабгрунтавана атрымала дыскрэтнасць, якая разрывала агульны культурна-асветніцкі рух супраць паланізацыі і асіміляцыі на «сваіх» і «чужых» [15, с. 6]. У выніку такой класіфікацыі на падставе існаваўшага з даваенных часоў штучнага падзелу «свае», названыя вышэй падкантрольныя КПЗБ арганізацыі і іх грамадска-культурная дзейнасць, мелі станоўчыя характарыстыкі. У прыватнасці, паводле І. Палуяна і У. Палуяна, перад пагрозай забароны ўладамі БСРГ яе кіраўніцтва прапанавала шырэй выкарыстоўваць у сваёй працы ТБШ, «кааператывы і іншыя масавыя арганізацыі працоўных», у выніку чаго ўзніклі дзясяткі хат-чытальняў, бібліятэк, клубаў, сельскагаспадарчых і асветніцкіх гурткоў, кааператываў, Саюз беларускіх настаўнікаў, ашчадныя касы настаўнікаў, а таксама сотні новых гурткоў ТБШ. З новай сілай разгарнуўся рух за адкрыццё беларускіх школ [15, с. 111]. У дадзеным выпадку неабходна адзначыць узважаны і аб’ектыўны характар інфармацыі гісторыкаў, якія ў абагульненай форме праілюстравалі кансалідацыю большасці беларускіх палітычных і культурных дзеячаў і актывізацыю ў выніку гэтага на падставе беларускіх прыярытэтаў нацыянальна-культурнага жыцця, у якім вядучую ролю адыгрывалі дзеячы нацыянальна-дэмакратычнага крыла, а не камуністы з іх лявацка-сектанцкімі замахамі.

Найбольшую ўвагу пытанням сацыяльна-культурнай гісторыі Заходняй Беларусі надаў У. Палуян, забяспечваючы выкладанне адпаведных пытанняў з больш высокай ступенню аб’ектыўнасці ў параўнанні з папярэднікамі. Яго навуковая смеласць у адносінах да нацыянальна-культурнай беларускай гісторыі праявілася ў актуалізацыі і бадай што прадметным даследаванні Таварыства беларускай школы, без якога немагчыма ўявіць як сацыяльна-культурную, так і грамадска-палітычную гісторыю Заходняй Беларусі БСРГ [16, с. 103–137, 214–238; 17, с. 146–150]. Акрамя асвятлення стану асветы і барацьбы за адкрыццё беларускіх школ, аўтар прэзентаваў дастаткова аб’ёмную для таго часу карціну іншых формаў сацыяльна-культурнага жыцця, найперш дзейнасць гурткоў ТБШ, у тым ліку арганізацыю народных дамоў і клубаў, хат-чытальняў, правядзенне спектакляў, вечарын, канцэртаў і інш. Аднак сацыяльна-культурная гісторыя пада-

валася ім з класавых пазіцый, была надзвычай палітызавана, абумоўлена палітычнымі задачамі рэвалюцыйнай дэмакратыі пад кіраўніцтвам КПЗБ і заставалася прэзентацыяй барацьбы за народную культуру «працы і барацьбы», за ізаляцыю культурна-асветніцкага ўплыву «беларускіх буржуазных нацыяналістаў», за інтэрнацыянальныя каштоўнасці, супраць буржуазнага і дробнабуржуазнага згодніцтва, паланізацыі і асіміляцыі.

Адметнасцю разглядаемага перыяду стала распрацоўка тэмы народнай адукацыі ў Заходняй Беларусі ў абагульненым выданні па гісторыі народнай асветы і педагагічнай думкі ў Беларусі і дысертацыі на суісканне ступені кандыдата педагагічных навук Г. Сянькевіч, якая дэманстравала ў цэлым відавочнае імкненне да аб’ектыўнасці [18; 19]. Даследаванне ўпершыню прадметна было накіравана на вывучэнне стану адукацыі, а не на яе выкарыстанне ў якасці ілюстрацыі акупацыйнай палітыкі Польшчы і рэвалюцыйнай барацьбы. У тагачасных традыцыях яно было абумоўлена савецкімі сацыяльна-класавымі ідэалагічнымі прыярытэтамі і накіравана на гіпербалізацыю недахопаў польскай сістэмы адукацыі. У цэлым, ацэньваючы адукацыйную палітыку «буржуазнага ўрада Польшчы» як паланізатарскую, антынародную, «падманлівую», нягледзячы на прыведзеную статыстыку і ілюстрацыю некаторых намаганняў у галіне школьнай асветы, даследчыца сцвярджала, што ўрад так «нічога і не прадпрыняў, каб ажыццявіць у Заходняй Беларусі ўсеагульнае пачатковае навучанне», наступствам такой арганізацыі «ўсенавуча» стала суцэльная непісьменнасць сярод насельніцтва [18, с. 341–342; 19, с. 11, 13, 15]. Гэтымі сцвярджэннямі Г. Сянькевіч супярэчыла не толькі існуючым у айчыннай гістарыяграфіі больш аб’ектыўным звесткам, нават міжваеннага часу, але і самой сабе, падаючы інфармацыю пра вядомыя захады польскіх улад па ўлагоджванні праблемы беларускага школьніцтва, акцэнтуючы ўвагу на законах аб адукацыі, найперш законах ад 31 ліпеня 1924 г., прызначочы наяўнасць польскіх школьных інспектараў з дэмакратычнымі перакананнямі і іх увагу да «голасу народа» [18, с. 346]. Не могуць быць прыняты і патрабуюць удакладнення некаторыя іншыя сцвярджэнні аўтара, у прыватнасці, пра адсутнасць у Заходняй Беларусі «дастатковай сеткі сярэдніх бясплатных школ». Сярэднімі навучальнымі ўстановамі з’яўляліся гімназіі, навучанне ў якіх было платным. Такім чынам, бясплатных «сярэдніх школ» сапраўды не было, але вядома, што дзеці незаможных бацькоў па рашэнні педагагічных саветаў гімназій вызваляліся ад аплаты за навучанне і атрымлівалі стыпендыі. Таму тэзіс аўтара аб «абмежаванні доступу працоўнай моладзі да сярэдняй адукацыі» некарэктны, тым больш на фоне згаданых закрытых шасці беларускіх гімназій (Будслаў, Нясвіж, Радашковічы, Клецк, Навагрудак і Вільня) і функцыянавання на тэрыторыі Заходняй Беларусі польскіх дзяржаўных гімназій. Па ўкаранёнай раней традыцыі даследчыца неабгрунтавана абвінаваціла беларускіх нацыянальна-культурных дзеячаў у згодніцтве і здрадзе інтарэсам працоўнага народа, падкрэсліваючы, што ў ажыццяўленні паланізатарскай школьнай палітыкі «актыўнымі пасобнікамі акупантаў» былі беларускія нацыяналісты, якія выступалі за «нацыянальную культуру, школу і выхаванне», «нейтральнасць школы», яны ішлі па шляху «мірнай культурніцкай працы» ў рамках буржуазнай дзяржавы, патрабавалі ўмацавання ў школах рэлігійнага выхавання, дапамагалі правячым колам пераўтвараць беларускія школы ў польскія. Разам з тым у Г. Сянькевіч тэма народнай асветы атрымала паглыбленне за кошт увядзення ў навуковы ўжытак вялікай колькасці архіўных матэрыялаў, якія адлюстроўвалі барацьбу беларускага насельніцтва за адкрыццё пачатковых, у тым ліку прыватных і тайных школ, іх матэрыяльна-тэхнічную базу, метадычныя прыярытэты і кадравае забеспячэнне. Наватарскімі былі звесткі аўтара аб прафесійнай адукацыі дарослых, для падрыхтоўкі кваліфікаваных рабочых ствараліся сельскагаспадарчыя, рамесна-прамысловыя, гандлёвыя і жаноцкія школы дамаводства [19, с. 12, 20].

Найбольш значным быў імпульс «адлігі» для тэматыкі выдавецкай дзейнасці, друку і прэсы Заходняй Беларусі, у дачыненні да якіх на падставе марксісцка-ленінскай схемы айчыннымі даследчыкамі быў ажыццёўлены рашучы зрух у выглядзе змястоўных напрацовак У. Палуяна [16, с. 83–88] і падрыхтоўкі прадметных публікацый і абароны кандыдацкіх дысертацый П. Зялінскім, М. Ракевічам, С. Говіным, Т. Талапінай, Я. Н. Марашам [20–24]. Іх тыповымі рысамі з’яўляліся сацыяльна-класавая рыторыка, ухваленне і ўзвелічэнне палітычнай і рэвалюцыйнай выдавецка-публіцыстычнай дзейнасці кампартыі, БСРГ, «Змагання», актуалізацыя сацыяльна-класавых прыярытэтаў, неабгрунтаваная гіпербалізацыя ўплыву пракамуністычных выданняў і «ленінскай

спадчыны», ігнараванне, замоўчванне ці негатыўнае стаўленне да выдавецка-публіцыстычнай дзейнасці непадкантрольных КПЗБ партый і арганізацый, выкрыццё «антынароднай сутнасці беларускага буржуазнага нацыяналізму». Разам з тым даследаванні ставяць пад пытанне вядомы савецкі тэзіс пра «ганенні на беларускую прэсу». Так, С. Говіным даследавана 245 заходнебеларускіх выданняў: газеты – каля 190, штотыднёвікі і часопісы – 55, з іх радыкальная прэса прадстаўлена ў колькасці 110: газеты – 104, часопісы – 6. Толькі друк БСРГ і блізкія да яго выданні па палітычнай скіраванасці былі прадстаўлены 22 перыядычнымі органамі і амаль 30 аднаднёўкамі [22, с. 3].

Нягледзячы на знаходжанне Польшчы ў адзіным з СССР складзе «сацыялістычнага лагера», адназначна адмоўным падаваўся польскі сацыякультурны ўплыў на насельніцтва Заходняй Беларусі як гвалтоўнае навязванне чужых культурна-гістарычных звычак і прыярытэтаў у выніку функцыянавання дзяржаўных устаноў, палітычных партый, насаджэння розных палітычных і культурна-асветніцкіх арганізацый «рэакцыйна-шавіністычнага характару» [25, с. 34–35; 26, с. 13; 27, с. 75–77; 28, с. 13].

Характэрнай рысай канцэптуальных поглядаў айчынных савецкіх аўтараў было ігнараванне сацыяльна-культурнага жыцця прадстаўнікоў іншых нацыянальных меншасцей, якія пражывалі ў Заходняй Беларусі, за рэдкім выключэннем згадвання яўрэйскіх, украінскіх і літоўскіх нацыянальна-культурных арганізацый і выданняў у кантэксце дзейнасці нацыянальных палітычных партый і груповак [25, с. 42–48; 27, с. 69–75; 28, с. 13–14].

У дачыненні да культурна-асветніцкай, як і грамадска-палітычнай, дзейнасці беларускіх нацыянальна-дэмакратычных арганізацый дэманстраваўся відавочны звужана-фрагментарна пададзены негатыў [15, с. 238–241, 267–274; 26, с. 14; 27, с. 63–68; 28, с. 15; 29, с. 18]. З такога выкладання атрымлівалася, што вялікая культурна-асветніцкая, навукова-даследчыцкая, краязнаўчая, музейная, бібліятэчная дзейнасць ТБШ, БІГіКа, Беларускага навуковага таварыства, Беларускага музея імя І. Луцкевіча, Таварыства беларускай асветы і іншых арганізацый і суполак, актыўная арганізацыйная і асабістая дзейнасць А. Луцкевіча, А. Станкевіча, Р. Астроўскага і многіх іншых мэтанакіравана мінімізаваліся, падвяргаючыся дыскрэдытацыі і дыфамацыі. Гэта тычыцца культурна-асветніцкай, мастацкай, літаратурнай дзейнасці арганізатараў і непасрэдных творцаў некамуністычнай арыентацыі, змест і маштаб працы якіх мэтанакіравана замоўчваліся, аб іх значнасці можна было атрымліваць ускосныя звесткі з аповядаў пра шкоднасць іх справы як актыўных прыхільнікаў «буржуазна-кулацкіх» каштоўнасцей, апанентаў народных традыцый і культуры. У падачы літаратурна-мастацкага жыцця асабліва яскравым прыкладам такіх падыходаў з'яўляецца літаратурная крытыка У. Калесніка [30–32]. Большай узважанасцю і аб'ектыўнасцю на гэтым фоне выдзяляюцца даследаванні А. Ліса [33–35], які, аднак, таксама вымушаны быў шукаць і адлюстроўваць сацыялістычныя, прагрэсіўныя рысы ў літаратурным і выяўленчым мастацтве.

Аналіз публікацый сведчыць пра недастатковае імкненне айчыннай гістарыяграфіі да навуковай дакладнасці і адназначнасці. Найбольш красамоўна гэта праяўлялася пры падачы колькасці беларускіх школ. Так, фігуруюць істотна розныя па паходжанні і змесце гістарыяграфічныя факты: каля 400 беларускіх школ, створаных у 1918–1919 гг. [15, с. 36]; да захопу Польшчай існавала каля 400 беларускіх школ, 2 настаўніцкія семінарыі, 5 гімназій, створаных у час Савецкай Рэспублікі ЛітБел [25, с. 31–32]; закрыты каля 350 беларускіх школ, створаных у 1918–1919 гг. «беларускай грамадскасцю» [17, с. 17]; больш 500 беларускіх пачатковых школ, адкрытых у 1917–1920 гг., да таго ж 186 беларускіх школ у Сярэдняй Літве [18, с. 342–343]. Тое самае назіраем і з падачай колькасці школ, якія засталіся пасля масавага закрыцця польскімі ўладамі: у 1926 г. у краі існавала толькі 4 беларускія школы [15, с. 36]; да 1924 г. засталося толькі 37 беларускіх школ [25, с. 31–32]; у 1923 г. існавала 37 беларускіх і 8 змешаных (польска-беларускіх) школ [17, с. 17]; у 1925/26 навучальным годзе засталося толькі 2 беларускія і 8 польска-беларускіх школ [18, с. 343]. Выяўленыя недакладнасці тлумачацца рознымі падыходамі да вызначэння тэрыторыі лакалізацыі школ, храналагічнага перыяду і выкарыстаных крыніц, у якасці якіх выступалі як афіцыйная польская статыстыка, так і выданні КПЗБ.

У цэлым неабходна адзначыць, што тэма сацыяльна-культурнай гісторыі ў асвятленні айчыннай гістарыяграфіі, нягледзячы на яе пашырэнне па некаторых кірунках у другой палове 1950-х –

1980-я гг., так і не стала прадметам манаграфічнага даследавання, у якім былі б аб'ектыўна прэзентаваны і атрымалі б узважаную ацэнку грамадска-палітычныя ўмовы, змест, ідэалогія, кадравая, матэрыяльна-тэхнічная і фінансавая база як асобных культурна-асветніцкіх установу, так і этнакультурная дзейнасць і сацыяльна-культурная сфера ўвогуле. Пры гэтым на манаграфічны ўзровень выйшла даследаванне гісторыі адукацыі, камуністычнага і дэмакратычнага друку.

Такім чынам, айчынная гістарыяграфія сацыяльна-культурнай гісторыі Заходняй Беларусі 1921–1939 гг. была абумоўлена партыйна-дзяржаўнай ідэалогіяй і прыярытэтам рэвалюцыйнай тэматыкі, якая апявала імкненне беларускага народа да вызвалення і нацыянальнай кансалідацыі. «Надбудовачны» стан праблемы ў сістэме марксісцка-ленінскай метадалогіі не спрыяў сістэмнай прадметнай распрацоўцы тэмы сацыяльна-культурнай гісторыі Заходняй Беларусі 1921–1939 гг., за выключэннем праблематыкі камуністычнага і дэмакратычгага друку і стану народнай адукацыі. Па-першае, тэматыка выкарыстоўвалася для пацвярджэння цяжкага становішча беларускага народа, абмежаванага жорсткім ціскам польскіх улад, і ў якасці ілюстрацыі рэвалюцыйнай барацьбы «за сацыяльнае і нацыянальнае вызваленне». Па-другое, сацыяльна-культурная гісторыя была дэтэрмінавана месцам і роляй кампартыі ў грамадска-палітычнай сітуацыі. Толькі звязаныя з камуністамі культурніцкія сілы атрымлівалі станоўчае адлюстраванне, у той час як культурна-асветніцкія справы апанентаў КПЗБ ігнараваліся, замоўчваліся ці зрэдку падаваліся ў негатыўным плане як спробы сарваць наладжаную працоўным народам пад кіраўніцтвам камуністаў сацыяльна-культурную справу як частку рэвалюцыйнай барацьбы. Па-трэцяе, аднaзначна адмоўным падаваўся польскі сацыякультурны ўплыў на Заходнюю Беларусь як гвалтоўнае навязванне чужых культурна-гістарычных каштоўнасцей, за выключэннем нязначных, падкантрольных польскай кампартыі, сацыяльна-культурных пляцовак. Па-чацвёртае, характэрнай рысай канцэптуальных поглядаў айчынных савецкіх аўтараў з'яўлялася ігнараванне сацыяльна-культурнага жыцця прадстаўнікоў іншых нацыянальных меншасцей, якія пражывалі ў Заходняй Беларусі, за рэдкім выключэннем згадвання яўрэйскіх, украінскіх і літоўскіх нацыянальна-культурных арганізацый і выданняў у кантэксце дзейнасці нацыянальных палітычных партый і груповак.

Сацыяльна-культурная праблематыка развівалася паводле марксісцка-ленінскіх сацыяльна-класавых канонаў, накіраваных на нівеліраванне нацыянальных рыс і выхаванне інтэрнацыяналісцкіх прыярытэтаў. Ігнараванне сацыякультурнай дзейнасці, якая не ўпісвалася ў фармат пралетарскай культуры, і стала вынікам духоўнай творчай дзейнасці прадстаўнікоў «чужых» сацыяльных і нацыянальных дзеячаў і суполак. У выніку адбылося збядненне сацыякультурнай гісторыі Заходняй Беларусі, адмаўленне ад значных дасягненняў беларускага народа ў матэрыяльнай і духоўнай культуры, у галіне адукацыі, навукі, літаратуры і мастацтва.

## Спіс выкарыстаных крыніц

1. Гужалоўскі, А. Музеі Беларусі (1918–1941 гг.) / А. Гужалоўскі. – Мінск : Нац. арх. Рэсп. Беларусь, 2002. – 164 с.

2. Вабішчэвіч, А. М. Нацыянальна-культурнае жыццё Заходняй Беларусі (1921–1939 гг.) / А. М. Вабішчэвіч. – Брэст : БрДУ, 2008. – 319 с.

3. Вабішчэвіч, А. Гісторыя і культура заходняй Беларусі і Усходняй Літвы (паўночна-ўсходніх зямель II Рэчы Паспалітай) у сучаснай беларускай і польскай гістарыяграфіі / А. Вабішчэвіч // Studia Białorutenistyczne. – 2013. – № 7. – С. 73–80. http://dx.doi.org/10.17951/sb.2013.7.73

4. Загідулін, А. М. Заходнебеларуская культура ў працах беларускіх гісторыкаў / А. М. Загідулін // Polacy i bialorusini. Nasza wspolna historia. Dwudziestolecie miedzywojenne : materialy z miedzynar. konf. nauk., Grodno, 11–13 czerw. 2010 r. – Гродно, 2011. – С. 123–130.

5. Загідулін, А. М. Гарадская культура Заходняй Беларусі (1921–1939) у айчыннай гістарыяграфіі / А. М. Загідулін // Гістарыяграфія і крыніцы па гісторыі гарадоў і працэсаў урбанізацыі ў Беларусі : зб. навук. арт. / Гродзен. дзярж. ун-т імя Я. Купалы. – Гродна, 2009. – С. 373–378.

6. Загідулін, А. М. Архітэктура Заходняй Беларусі (1918–1921 гг.): гістарыяграфія праблемы / А. М. Загідулін // Белорусская политология: многообразие в единстве. Политическое знание в современном социальном и образовательном пространстве : тез. докл. V Междунар. науч.-практ. конф., Гродно, 17–18 мая 2012 г. : в 2 ч. / Гродн. гос. ун-т им. Я. Купалы ; редкол.: В. Н. Ватыль [и др.]. – Гродно, 2012. – Ч. 1. – С. 185–188.

7. Горбунов, Т. Воссоединение белорусского народа в едином советском социалистическом государстве / Т. Горбунов. – М. : Госполитиздат, 1948. – 232 с.

8. Гісторыя Беларускай ССР : у 2 т. / Акад. навук Беларус. ССР, Ін-т гісторыі. – Мінск : Выд-ва Акад. навук БССР, 1955–1958. – Т. 2 / пад рэд. І. С. Краўчанкі, Н. В. Каменскай. – 1958. – 661 с.

9. НАРБ. – Ф. 1440. Воп. 1. Спр. 149.
10. Орехво, Н. К вопросу об истории Коммунистической партии Западной Белоруссии / Н. Орехво // Коммунист Белоруссии. – 1957. – № 8. – С. 25–36.
11. Bergman, A. Bronisław Taraszkiewicz a lewica belwederska / A. Bergman // Kwartalnik Historyczny. – 1968. – № 1. – S. 41–58.
12. Bergman, A. Rzecz o Bronisławie Taraszkiewiczu / A. Bergman. – Warszawa : Książka i wiedza, 1977. – 243 s.
13. Клейн, Б. Старонкі палымянага жыцця / Б. Клейн // Полымя. – 1963. – № 10. – С. 141–153.
14. Ліс, А. Браніслаў Тарашкевіч / А. С. Ліс. – Мінск : Навука і тэхніка, 1966. – 167 с.
15. Полуян, В. А. Революционное и национально-освободительное движение в Западной Белоруссии в 1920–1939 гг. / В. А. Полуян, И. В. Полуян. – Минск : Госиздат, 1962. – 222 с.
16. Полуян, В. А. Революционно-демократическое движение в Западной Белоруссии (1927–1939 гг.) / В. А. Полуян. – Минск : Наука и техника, 1978. – 359 с.
17. Палуян, У. А. Беларуская сялянска-рабочая грамада / У. А. Палуян. – Мінск : Навука і тэхніка, 1967. – 222 с.
18. Сянькевіч, Г. Р. Народная асвета ў Заходняй Беларусі / Г. Р. Сянькевіч // Нарысы гісторыі народнай асветы і педагагічнай думкі ў Беларусі / Навук.-даслед. ін-т педагогікі М-ва асветы БССР. – Мінск, 1968. – С. 341–395.
19. Сенькевич, Г. Г. Состояние народного образования в Западной Белоруссии (1920–1939 гг.) : автореф. дис. … канд. пед. наук : 730 / Г. Г. Сенькевич ; Науч.-исслед. ин-т теории и истории педагогики АПН СССР. – М., 1969. – 28 с.
20. Зелинский, П. И. Роль печати Коммунистической партии Западной Белоруссии в мобилизации трудящихся масс на борьбу за социальное и национальное освобождение в годы мирового экономического кризиса капитализма (1929–1933 гг.) : автореф. дис. ... канд. ист. наук : 570 / П. И. Зелинский ; Белорус. гос. ун-т. – Минск, 1969. – 19 с.
21. Ракевич, Н. А. Роль нелегальной коммунистической печати Западной Белоруссии в мобилизации трудящихся масс на борьбу за социальное и национальное освобождение (1921–1929 гг.) : автореф. дис. ... канд. ист. наук : 570 / Н. А. Ракевич ; Ин-т истории партии при ЦК КПБ. – Минск, 1969. – 23 с.
22. Говин, С. В. Демократическая печать Западной Белоруссии в борьбе за социальное и национальное освобождение трудящихся (1921–1939 гг.) : автореф. дис. ... канд. ист. наук : 07.580 / С. В. Говин ; Белорус. гос. ун-т. – Минск, 1971. – 21 с.
23. Талапина, С. В. В. З. Хоружая – революционер-публицист : автореф. дис. … канд. ист. наук : 07.00.10 / С. В. Талапина ; Белорус. гос. ун-т. – Минск, 1975. – 27 с.
24. Мараш, И. Я. Издание и распространение трудов В. И. Ленина в Польше и Западной Белоруссии в межвоенный период (1918–1939 гг.) : автореф. дис. … канд. ист. наук : 07.00.02 / И. Я. Мараш. – Минск, 1975. – 23 с.
25. Революционный путь Компартии Западной Белоруссии (1921–1939 гг.) / А. Н. Мацко [и др.] ; под ред. А. Н. Мацко, В. Е. Самутина. – Минск : Беларусь, 1966. – 403 с.
26. Воткович, Г. Б. КПЗБ в борьбе за интернациональное единство трудящихся (1929–1933 гг.) / Г. Б. Воткович. – Минск : Изд-во БГУ им. В. И. Ленина, 1975. – 128 с.
27. Кобяк, С. В. Под знаменем пролетарской солидарности: Компартия Западной Белоруссии в борьбе за сплочение трудящихся (1923–1929 гг.) / С. В. Кобяк ; науч. ред. А. Н. Мацко. – Минск : Беларусь, 1979. – 142 с.
28. Зелинский, П. И. Политическая работа КПЗБ в массах, 1923–1938 / П. И. Зелинский. – Минск : Университетское, 1986. – 136 с.
29. Клейн, Б. С. За дело правое: борьба КПЗБ с буржуазным террором (1920–1938 гг.) / Б. С. Клейн. – Минск : Беларусь, 1986. – 175 с.
30. Колесник, В. А. Творчество Максима Танка: (до сентября 1939 года) : автореф. дис. … канд. филол. наук / В. А. Колесник. – Минск, 1958. – 15 с.
31. Калеснік, У. А. Паэзія змагання: Максім Танк і заходнебеларуская літаратура / У. А. Калеснік. – Мінск : Маст. літ., 1959. – 236 с.
32. Калеснік, У. А. Час і песні: літаратурныя нарысы і партрэты / У. А. Калеснік. – Мінск : Дзярж. выд-ва БССР, 1962. – 240 с.
33. Лис, А. С. Народно-поэтическое творчество Западной Белоруссии (1919–1939 гг.) : автореф. дис. … канд. филол. наук / А. С. Лис ; АН БССР, Ин-т лит. им. Я. Купалы. – Минск, 1965. – 18 с.
34. Ліс, А. Пётра Сергіевіч / А. Ліс. – Мінск : Навука і тэхніка, 1970. – 88 с.
35. Ліс, А. Вечны вандроўнік: нарыс пра мастака Язэпа Драздовіча / А. Ліс. – Мінск : Юнацтва, 1984. – 251 с.

## References

1. Guzhalouski A. A. *Museum of Belarus (1918–1941 gg.).* Minsk, National Archives of the Republic of Belarus, 2002. 164 p. (in Belarusian).
2. Vabishchevich A. M. *National and cultural life of Western Belarus (1921–1939 gg.).* Brest, Brest State University, 2008. 319 p. (in Belarusian).
3. Vabishchevich A. History and Culture of Western Belarus and eastern Lithuania (AI Rzeczpospolita northeastern states) in the modern Belarusian and Polish historiography. *Studia Białorutenistyczne = Belarusian Studies*, 2013, no. 7, pp. 73–80 (in Belarusian). http://dx.doi.org/10.17951/sb.2013.7.73
4. Zagidulin A. M. Culture Western Belarus in the works of Belarusian historians. *Polacy i bialorusini. Nasza wspolna historia. Dwudziestolecie miedzywojenne: materialy z miedzynarodowej konferencji naukowej, Grodno, 11–13 czerwca 2010 r.* [Poles and Belarusians. Our shared history. The interwar period: materials from the international scientific conference, Grodno, 11–13 June 2010]. Grodno, 2011, pp. 123–130 (in Belarusian).
5. Zagidulin A. M. Urban Culture Western Belarus (1921–1939) in the national historiography. *Gistaryyagrafiya i krynitsy pa gistoryi garadoў i pratsesaў urbanizatsyi ў Belarusi: zbornik navukovykh artykulau* [Historiography and sources on the history of cities and urbanization processes in Belarus: collection of scientific article]. Grodno, 2009, pp. 373–378 (in Belarusian).

6. Zagidulin A. M. Architecture of Western Belarus (1918–1921 gg.): historiography of the problem. *Belorusskaya politologiya: mnogoobrazie v edinstve. Politicheskoe znanie v sovremennom sotsial'nom i obrazovatel'nom prostranstve: tezisy dokladov V mezhdunarodnoi nauchno-prakticheskoi konferentsii, Grodno, 17–18 maya 2012 g.* [Belarusian political science: diversity in unity. Political knowledge in the modern social and educational space: theses of reports of the V International scientific practical conference, Grodno, May 17–18, 2012]. Grodno, 2012, pt. 1, pp. 185–188 (in Belarusian).

7. Gorbunov T. *Reunion Belarusian people in a single Soviet Socialist State*. Moscow, Gospolitizdat Publ., 1948. 232 p. (in Russian).

8. Krauchanka I. S., Kamenskaya N. V. (eds.). *History of the Belarusian SSR. Vol. 2*. Minsk, Publisher Academy of Sciences of the Byelorussian SSR, 1958. 661 p. (in Belarusian).

9. *National Archive of the Republic of Belarus*. Fund 1440, inventory 1, case
149 (in Russian).

10. Orekhvo N. *On the history of the communist party of Western Belarus. Kommunist Belorussii* [Communist of Belarus], 1957, no. 8, pp. 25–36 (in Russian).

11. Bergman A. *Bronisław Taraszkiewicz a lewica belwederska* [Bronisław Taraszkiewicz and the Belvedere left]. *Kwartalnik Historyczny* [Historical Quarterly], 1968, no. 1, pp. 41–58 (in Polish).

12. Bergman A. *Rzecz o Bronisławie Taraszkiewiczu* [It's about Bronisław Taraszkiewicz]. Warszawa, Książka i wiedza, 1977. 243 p. (in Polish).

13. Klein B. Pages fiery life. *Polymya* [Flames], 1963, no. 10, pp. 141–153 (in Belarusian).

14. Lis A. *Bronislaw Tarashkevich*. Minsk, Navuka i tekhnika Publ., 1966. 167 p. (in Belarusian).

15. Poluyan V. A., Poluyan I. V. *Revolutionary and national liberation movement in Western Belarus in 1920–1939 gg.* Minsk, Gosizdat Publ., 1962. 222 p. (in Russian).

16. Poluyan V. A. *The revolutionary-democratic movement in Western Belarus (1927–1939 gg.).* Minsk, Nauka i tekhnika Publ., 1978. 359 p. (in Russian).

17. Paluyan U. A. *Belarusian peasant-working community.* Minsk, Navuka i tekhnika Publ., 1967. 222 p. (in Belarusian).

18. Syan'kevich G. R. People asveta in Western Belarus. *Narysy gistoryi narodnai asvety i pedagagichnai dumki u Belarusi* [Essays on the history of public education and educational thought in Belarus]. Minsk, 1968, pp. 341–395 (in Belarusian).

19. Sen'kevich G. G. *Status people's court in the Western Belarus (1920–1939 gg.).* Abstract of Ph.D. diss. Moscow, 1969. 28 p. (in Russian).

20. Zelinskii P. I. *Print the role of the Communist Party of Western Belarus in the mobilization of the working masses in the struggle for social and national liberation during the world economic crisis of capitalism (1929–1933 gg.*). Abstract of Ph.D. diss. Minsk, 1969. 19 p. (in Russian).

21. Rakevich N. A. *The role of the illegal Communist press of Western Belarus in the mobilization of the working masses in the struggle for social and national liberation (1921–1929 gg.).* Abstract of Ph.D. diss. Minsk, 1969. 23 p. (in Russian).

22. Govin S. V. *Democratic press of Western Belarus in the struggle for social and national liberation of workers (1921–1939 gg.).* Abstract of Ph.D. diss. Minsk, 1972. 21 p. (in Russian).

23. Talapina S. V. *Vera Khoruzhaya – revolutionary publicist*. Abstract of Ph.D. diss. Minsk, 1975. 27 p. (in Russian).

24. Marash I. Ya. *Publication and dissemination of works of VI Lenin in Poland and Western Belarus in the interwar period (1918–1939 gg.).* Abstract of Ph.D. diss. Minsk, 1975. 23 p. (in Russian).

25. Matsko A. N., Orekhvo N. S., Pritytskaya T. I., Khovratovich I. P., Tsaryuk A. V. *A revolutionary way of the Communist Party of Western Belarus (1921–1939).* Minsk, Belarus' Publ., 1966. 403 p. (in Russian).

26. Votkovich G. B. *KPZB in the struggle for the international unity of workers*. Minsk, Publishing house of the Belarusian State University, 1975. 128 p. (in Russian).

27. Kobyak S. V. *Under the banner of proletarian solidarity: the Communist Party of Western Belarus in the struggle to unite the workers (1923–1929).* Minsk, Belarus' Publ., 1979. 142 p. (in Russian).

28. Zelinskii P. I. *Political work of the Communist Party of Western Belarus in the masses, 1923–1938.* Minsk, Universitetskoe Publ., 1986. 136 p. (in Russian).

29. Klein B. S. *For the cause of justice: the struggle of the KPZB with bourgeois terror*. Minsk, Belarus' Publ., 1986. 175 p. (in Russian).

30. Kolesnik V. A. *Works of Maxim Tank: (until September 1939).* Abstract of Ph.D. diss. Minsk, 1958. 15 p. (in Russian).

31. Kalesnik U. A. *Poetry struggle: Maxim Tank and Western Literature*. Minsk, Mastatskaya litaratura Publ., 1959. 236 p. (in Belarusian).

32. Kalesnik U. A. *Time and songs. Literary essays and portraits*. Minsk, State Publishing House of the BSSR, 1962. 240 p. (in Belarusian).

33. Lis A. S. *People's Poetry Western Belarus (1919–1939*). Abstract of Ph.D. diss. Minsk, 1965. 18 p. (in Russian).

34. Lis A. *Peter Sergievich*. Minsk, Navuka i tekhnika Publ., 1970. 88 p. (in Belarusian).

35. Lis A. *Eternal Wanderer: essay about the artist Joseph Drozdovich*. Minsk, Yunatstva Publ., 1984. 251 p. (in Belarusian).

## Информация об авторе

**Савич Александр Александрович** – кандидат исторических наук, доцент. Брестский государственный университет им. А. С. Пушкина (бул. Космонавтов, 21, 224016, Брест, Республика Беларусь). E-mail: savich@brsu.brest.by

## Information about the author

**Aliaksandr A. Savich** – Ph. D. (Hist.), Associate Professor. Brest State University named after A. S. Pushkin (21 Kosmonavtov Boulevard, 224016 Brest, Belarus). E-mail: savich@brsu.brest.by